**Вашкевіч, А.** Ён вельмі любіў кветкі / А. Вашкевіч // Ленінскі сцяг (Лепель). — 1989. — 13 мая. — С. 2.

## ЁН ВЕЛЬМІ ЛЮБІЎ КВЕТКІ

– Якім быў мой Сярожанька, пытаецеся? Ды дай бог усім маці такіх сыноў мець. Не пахлапечаму пяшчотны. Бывае, накрычу на яго. За нівошта, як цяпер, разумею. А ён кінецца да мяне, абдыме, пацалуе і скажа: «Матуля, я ж твой сынок». Ну як я, маці, магла пасля такой ласкі не даравадь васьмігадоваму хлапчуку яго гарэзлівасць.

Гарэзны Сярожа быў, хоць і хваравіты. Даймаў яго бранхіт. Магчыма, і я ў гэтым вінавата. А дзе ж часу было ўзяць, каб дагледзець як след дзіцяці, калі сям'і і жыць не было дзе. Будаваліся мы тады. Бацька не ведаў, што такое адпачынак. Рубіў зруб па выхадных, адвячоркамі, а днём жа, вядома, працаваў на заводзе, Ён працуе на экскаватарарамонтным шафёрам.

Я сама выхоўвалася ў дзіцячым доме. Там мне прывілі такія агульначалавечыя рысы, як працавітасць, сумленнасць, павага да старэйшых, вернасць у дружбе, непрыязнасць да крыўды, хлусні. Сярожа і рос такім. Бачыў, што мне нялёгка даводзіцца, дапамагаў, чым мог. **А** рос ён кемлівым, шустрым. Навучыўся кухарыць, шыць на машынцы. Бывае, папросіць, каб спякла пірог. Вельмі любіў, каб з яблыкамі. Заўсёды ішла насустрач яго пажаданню. А часам, калі было некалі, скажу: спячы сам. І бачу з сястрой Кацяй іх на кухні. Усё зробяць па-сапраўднаму. Пірог у іх атрымаецца не горшы, чым у мяне, Любіў ён частаваць пірагом усіх.

Навучыўся шыць на машынцы. Усе суседскія хлапчукі прыходзілі да Сярожы, каб ён падагнаў ім тыя самыя джынсы. А для мяне фартух сшыў. Берагу яго цяпер...

Да яго цягнуліся падлеткі. Ён ніколі не заставаўся адзін. І дома, і на вуліцы, і ў школе – усюды яго я бачыла ў «палоне» равеснікаў, і знаёмых, і незнаёмых мне.

Вельмі любіў дамашніх звяроў. Калі дзе знойдзе выкінутых кацяня ці шчанюка, абавязкова прынясе дамоў. Выхадзіць іх. У Сярожу, бачна, і Наташка пайшла, наша меншая. Кветкі любіў. Заўсёды ў доме яны былі і летам, і зімой.

Не любіў, калі хлусяць. З-за гэтага ў яго канфлікты былі ў школе. Памятаецца, выклікалі мяне туды. Хтосьці з дзяцей зламаў крэсла. Падазрэнне пала на Сярожу. Сурова я тады абышлася з ім. Ён стаяў на сваім: «Не я гэта зрабіў». Каб спыніць канфлікт, я сказала: «Ты, Сярожа, самы большы ў класе. За ўсё павінен адказваць». Заплаціла я тады за тое крэсла. І цяпер бачу яго пакрыўджаныя вочы, чую крык: «Мама, гэта не я зрабіў!».

Кожная маці хвалюецца за свайго дзіцяці, вучыць яго быць справядлівым, не крыўдзіць слабейшых. І я хацела, каб Сярожа не крыўдзіў нікога. Гаварыла: калі бачыш няпраўду, заступіся за пакрыўджанага, будзь мужчынам заўсёды. Такім я яго і выгадавала.

Раскажу пра такі выпадак. Здарыўся ён на танцах. Падвыпіўшы хлопец патрабаваў ад дзяўчыны (яе, здаецца, звалі Ларыса), каб яна пайшла з ім танцаваць. Тая адмовілася. Хлопец пакрыўдзіў дзяўчыну: ударыў. Сярожа заступіўся. Суняў хулігана…

Нічога не бывае выпадковым. Добрыя якасці ў чалавека выхоўваюцца з маленства. На жаль, не ўсім маці ўдаецца гэта. Таму, бачна, і хуліганства яшчэ многа, і падману. Лічу, што вінаваты ва ўсім бацькі.

Калі сын вырас хуліганам, злачынцам, значыць, бацькі ўпусцілі штосьці важнае ў выхаванні. «Не заўсёды сумленным добра», – зазначыла неяк мая старэйшая, Кацярына. «Ведаю,– адказала я ёй. –Але інакш я вас не магу выхоўваць. Я сама сумленная».

На сваім прыкладзе і выхоўвала дзяцей. Трэба, каб душа была чыстая...

Ці мала такіх выпадкаў бывае ў жыцці: хуліганы прыстаюць да прахожага, гуртам збіваюць аднаго. Раз ішла я з вакзала. І бачу: трое збіваюць аднаго. А побач жа людзі, але ніхто не заступаецца. Не змагла я прайсці міма, кінулася на дапамогу пацярпеўшаму незнаёмаму. А мяне пасля яшчэ і папракнулі некаторыя: маўляў, навошта ты ўмяшалася. Гэта ж і небяспечна, і невядома, з чаго яны пабіліся. Вось так яшчэ мяркуюць у нас аб відавочным злачынстве.

Як сёння бачу Сярожу падстрыжанага ў час провадаў у армію. Ужо ўсе госці пайшлі да ваенкамата, а ён ніяк не можа развітацца з домам, са мной. Як чуў, што не вернецца...

Пісаў, што служыць у Манголіі. Ды адчувала маё сэрца, што не там. Напісала я пісьмо, каб расказаў праўду. І, нарэшце, атрымала пісьмо. Яно і цяпер захоўваецца Як цяжка было Сярожу прызнацца ў тым, што раней гаварыў няпраўду. Ён жа ніколі не хлусіў. Ды вельмі перажываў за мяне. Я ведаю чаму. Загінуў у Афганістане сябар Сярожы – Уладзімір Садоўскі. Сярожа тады яшчэ быў дома, бачыў, як плакала маці Валодзі. Не стрьмалася ад слёз і я, бо добра ведала Валодзю.

«...Ты ж тады, мама, так плакала. Вось таму і схлусіў я аб месцы службы. Даруй за гэга».

У наступных пісьмах Сярожа ўжо быў заўсёды шчырым, але стрыманым. «Служба ідзе нармальна, не сумуйце», – пісаў ён.

Гэта сёння я ведаю, як там цяжка даводзілася нашым сынам, там, у Афганістане. Там ёсць свая дарога жыцця. Такая, якая была ў нас у час блакады Ленінграда. Вядзе яна ад Савецкага Саюза да Кабула. Вось на гэтай дарозе нёс службу Сярожа. Вадзіў бранявік, суправаджаў нашы калоны з грузамі. А гэта ж дарога, як вядома, была пад прыцэлам душманаў…

У адным з пісьмаў Сярожа пісаў: «Быў ля самай граніцы, стаяў на афганскім беразе Амудар’і. Бачу, на тым, родным беразе ходзяць савецкія людзі. Так захацелася дамоў. Здаецца, птушкай пераляцеў бы раку. Ды трэба ехаць назад»

Шмат пісем атрымала я. І толькі ў двух з іх пачула: вельмі сумуе Сярожа па дому. А так усё было добра ў яго пісьмах.

Потым яго перавялі ў Кабул. Там ён і загінуў.

Вольга Уладзіміраўна закончыла расказваць, дастала альбом. Вось яе Сярожа дашкольнік, вось ён у школе са сваімі сябрамі. Вось выпускнік. Шырокі ў плячах, рослы. Позірк адкрытых вачэй звернуты як бы ў душу. Нос кірпаты. За гэта, бачна, і звалі яго саслужыўцы «бульбінкай». Адну з фатаграфій мы папрасілі ўзяць з сабой для газеты. На ёй Сяргей за рулём. Побач з ім яго сябар. За плячамі салдата ўжо тысячы кіламетраў гарачых афганскіх дарог.

Брацтва афганцаў змацавана крывёю. Яно з часам, здаецца, становіцца яшчэ больш трывалым. Кожны год у час гібелі Спірыдовіча прыязджаюць у Лепель яго сябры, прыходзяць на магілу, успамінаюць (яшчэ юныя) ветэраны дарогі Афганістана, баі з душманамі. А ў растанні пішуць пісьмы адусюль: з Баку, Курска, Чэлябінска...

«Дарагая бабуля!» – пішацца ў адным з іх. Гэта сябар Сярожы паведамляе пра тое, што ў сям'і нарадзіўся сын. Вось ён і шле прывітанне бабулі Волі. Ад такога прывітання нібы святлей стала. Пагаварыла бабуля з дзядулем Антонам ды і паслала ўнуку падарункі.

У другім пісьме чытаеш: «Дзякуй за сына. Вы яго выхавалі правільна».

Там, у Афганістане, магчыма, у часы пасля баёў Сяргей расказваў сябрам: «Прыедзеце да нас пасля службы, пабачыце, якая добрая ў мяне мама». Аб гэтым расказвалі сябры, калі прыехалі ў Лепель. Цёпла, нібы родных, сустракаюць іх Спірыдовічы.

– Яны для мяне родныя, – гаворыць Вольга Уладзіміраўна. – Убачу іх, расцалую. Нібы Сярожа прыехаў з імі.

Ідзе час. Але не праходзіць смутак маці. І кожны раз, вяртаючыся з працы, яна заглядвае ў паштовую скрынку…

**А. Вашкевіч**

**На здымку:** Сяргей Спірыдовіч (злева) у час вайны ў Афганістане